# Ад рэдактара

Да зместу

Шаноўныя чытачы! Прапануем вам 4 нумар нашага часопісу. Гэта заключны нумар, што быў запланаваны на 2009 год. Спадзяемся, што ён вам спадабаецца і некаторыя змены, зробленыя у канцэпцыі часопісу, будуць ацэненыя.

Для калектыву рэдакцыі гэты год быў знакавым. Наша мара, ідэя змагла пераўтварыцца ў рэчаіснасць. Калі гурток "Scriptorium" толькі пачаў праводзіць свае паседжанні, ідэя ўласнага часопісу здавалася нечым неверагодным і недасягальным. Нават не ўспрымалася ўсур'ёз. Збіраючы дакументы восенню 2008 года спадзяванні на поспех былі прывіднымі.

Тым большай радасцю аказалая навіна, што мы усё ж сталі пераможцамі.Гэта быў неверагодны імпульс. Кожны быў перапоўнены энтузіязмам. Тое, што нам далі грант, азначала, што наша праца некаму патрэбна, што яна мае сэнс. І дзейнасць закіпела. З'яўленне першага нумара было прынята з цікавасцю. Другі атрымаў колькі водгукаў. Трэці ж быў ужо заканамернасцю.

Шмат што змянілася за час працы ад першага нумару. Змянілася ўнутраная структура, знешні выгляд і тэхнічнае выкананне, колькі разоў мяняліся пасады ў рэдкалегіі...

Сапраўды, у нашай невялікай кампаніі неаднаразова змяняліся настроі. Аказалася не так проста здолець скаардынаваць дзянні, каб кожны знаходзіўся на сваім месцы, каб праца ішла аператыўна. Былі і спрэчкі, і крызісы, і канфлікты... Але мы прайшлі праз гэта і справа працягваецца.

Зараз мы плануем больш шчыльна заняцца Інтэрнет версіяй часопісу, каб у хуткім часе перайсці на яе цалкам. Спадзяюся, што кола нашых чытачоў і аўтараў пашырыцца.

Калі ласка, пішыце свае водгукі на асобныя артыкулы і на нумар увогуле, дасылайце нам свае прапановы, пажаданні і ідэі. Нам вельмі важна адчуваць, што наша праца вам патрэбна. Дзякуй усім, хто далучыўся, хто прапаноўвае сваю дапамогу, хто удзельнічае ў дыскусіях і натхняе нас на рух наперад.

Галоўны рэдактар